Не ўпершыню звяртаецца пісьменніцкі тандэм Масляніцына – Багадзяж да жанчын у беларускай гісторыі. Чытачы і асабліва чытачкі будуць уражаны вобразамі нашых выбітных зямлячак. Дачка Усяслава Чарадзея, жонка спадчынніка візантыйскага базілеўса Зоя Камніна, з'яўляецца аўтаркай першай навуковай працы па медыцыне ў еўрапейскай гісторыі — трактата «Мазі», напісанага на грэчаскай мове ў 1130 годзе, большая частка якога была прысвечана акушэрству і догляду за немаўлятамі. Жанчыны ў беларускай гісторыі, па зразумелых прычынах, найчасцей заставаліся на другасных ролях, але калі лёс прымушаў іх надзець кальчугу альбо наладжваць гаспадарку, аніколькі не саступалі мужчынам. Слуцкі князь Сямён Алелькавіч і яго жонка Анастасія ўвайшлі ў гісторыю Беларусі як ратаборцы — абаронцы Слуцкага княства ад набегаў крымскіх татар; пасля смерці князя змагацца з ворагамі давялося мужнай Анастасіі. Ганна Радзівіл, калі спачыў яе муж Караль Станіслаў, выкупіла закладзеныя маёнткі, пабудавала масты, дамбы, млыны, стварыла мануфактуры, фабрыкі і дала дарогу рамёствам, паказаўшы сябе першай у краіне жанчынай, якая ўзялася за нязвыклую справу — развіццё прамысловасці — і дасягнула поспеху. Сярод герояў вызваленчага паўстання 1830–1831 гадоў пачэснае месца займае Эмілія Плятэр, якая жыла дзеля высакароднага імкнення — аддаць жыццё за шчасце Айчыны. Не бракуе ў кнізе і рамантычных гісторый пра каханне.

Багаты матэрыял, апрацаваны і прадстаўлены даследчыкамі, сведчыць: маладым беларусам ёсць чым ганарыцца. Наша гісторыя гераічная, павучальная і неверагодна цікавая.

**Алена БРАВА**

## Анхела Эспіноса Руіз
*г. Малага, Іспанія*

* * *

Калісь ты называў сябе паэтам:
Давай вып´ем з табой віна за гэта
Між сцюжай тваіх рук
І калючай каметай.
Калісьці па вясне бывала лета,
Па выбуху сузор´яў — пацалункі.
Чужымі будуць заўтра твае думкі,
Чужым твой след і вузкаю дарога
З-пад коўдры да трывогі.
Цябе ў маім улонні ўжо не многа...
А меркавала я ў сваім бяскрыллі,
Што зноў пасею ў снах насенне часу,
І зацвіце любоў апошняй хвіляй,
Ці заспявае злосць зямным Пегасам,
Ці музыка нас згасіць,
Або загіне свет,
Калі яго напіша мой паэт.

* * *

Горад запаўняецца святлом —
Радасным, дзівосным, жураўліным.
Ты трымаеш на руках наш дом,
Я трымаю кветкі з белай гліны.

А праспект заснежаны, пусты,
Сумны, ганарысты ды адзіны.
Сняцца мне на ім твае сляды,
Як і небу сніцца след птушыны.

Ты ідзеш дарогаю надзей,
Я іду па цёмных шляхах мора,
Над табой спявае салавей,
Нада мною ціха, як учора.

Горад запаўняецца святлом,
Ліхтароў ці поўні — неістотна.
На праспекце шчэ стаіць наш дом,
Горасны, пакінуты, самотны.

Мы памрэм — замоўкне салавей,
А пакуль, душа, трымайся годна.
Як мы не заўважылі раней?
Божа, як у горадзе халодна!

Вуснамі старога забыцца
Мары, крозы зноў з´ядае горад.
У цябе ў кішэні паўжыцця.
А ў мяне ўсё пуста, як учора.





# Ліпеньскі сшытак



## Літаратурны выпуск «Алесі»

*Шаноўныя чытачы і аўтары «Алесі»!*

Штогод да вас прыходзіць «Ліпеньскі сшытак» — літаратурны выпуск нашага часопіса. Як звычайна, сёлета гэтаму папярэднічаў конкурсны адбор: на працягу трох месяцаў аматары прыгожага пісьменства дасылалі нам свае вершы і прозу. Лепшыя з твораў і склалі выпуск, які вы трымаеце ў руках.

Варта адзначыць, што актыўнасць канкурсантаў у гэтым годзе аказалася надзвычай высокай. Мы атрымалі некалькі дзясяткаў лістоў з вершамі і аповедамі, лісты працягваюць ісці і зараз. Рэдакцыя «Алесі» ўдзячная кожнаму, хто далучыўся да праекта. Гэта паказвае, наколькі шмат людзей не ўяўляюць свайго жыцця без радка. Кожнага разу мы ўпэўніваемся: сярод беларусаў багата адораных. І няхай не ўсе тэксты, якія мы атрымалі, можна з поўным правам назваць мастацкімі, важна тое, што творчасць дорыць вам імгненні шчасця і разняволенасці, дазваляе ўзняцца над будзённасцю.

Выбраць сярод дасланых тэкстаў найлепшыя было насамрэч нялёгкай задачай. Не сумуйце, калі не знайшлі свае творы ў «Ліпеньскім сшытку». Самае галоўнае, безумоўна, — асалода, якую дорыць вам творчасць.

Ёсць у нас і навіна, якая парадуе многіх. Па шматлікіх вашых просьбах у «Алесі» аднавілася паэтычная рубрыка, якой мы далі назву «Крылы». І з´яўляцца яна цяпер будзе ў кожным нумары! Там будуць публікавацца вершы беларускіх паэтак і паэтаў, як вядомых, так і тых, хто не ставіць перад сабой задачы скарыць прафесійны літаратурны Алімп. Так што вы па-ранейшаму можаце дасылаць вынікі свайго творчага плёну ў рэдакцыю на электронны адрас alesya@zviazda.by — найлепшыя з іх будуць надрукаваныя.

Жадаем аўтарам натхнення, а чытачам «Ліпеньскага сшытка» — прыемнай сустрэчы з творчасцю.

**Рэдактар выпуску Алена БРАВА**

## Крысціна Бандурына

*г. Мінск*

***

А помніш:
пальцы на рэбрах,
голас да хрыпу,
пляск хваль,
чайкі над намі
і промні ныраюць у вочы?

З адчаем:
«Не адпускай мае вусны,
не зараз,
не адпускай...»
Халоднае воднае срэбра.
Мы разрываем моўчкі

абдымкі. Мелодыя тысячы струн
ува мне разбіваецца вобзем.
І вострае джала — майму нутру:
«Вось табе!
Вось табе!
Вось...»

А помніш:
нос у тваё плячо,
асфальт у слязах
і лёгкія — да пустаты?

Першы вясенні дождж
на тваіх валасах
пакінуў срэбра вады.



Малюнак
Андрэя
Духоўнікава

***

кажуць, будзе чума
і выкасіць усіх
я збіраю ў дарогу
горад першых гісторый

асіплыя чайкі
аўтобус, метро, цягнік
кажуць, там на дваіх
няма
б’е пад дых
стома ў пяшчотна-зялёных
тваіх

пара дадому

дапіць свой астылы чай
і халера з усім
з гарадамі і іх раздарожжам
беражы сябе, мілая
абяцай
што будзеш

кожнай
свой квіток да канечнай
людзі ломяцца ў вагон
у аблокі ляцяць кольцы дыму

кажуць, усё замыкнецца
і я твайму наўздагон
тады

і заб’ецца мацней
і выйдзе дарога

так многа
вакол
і ніводнай такой
ні шнараў на пальцах
ні росчырку броваў
птушынага

твае мокрыя вусны
апусцелы перон

аднойчы
знайдзі мяне

### Шлях памяці

Чытаеш Кракаў:
манументальнасць і сорам,
спакой і хмурнасць,
віно і хумус,
крамы і камеры,
задумлівы Вавель,
віхры галубоў.

Горад памёр.
Попел — на некалькі пальцаў,
трошкі льду і вада.

*We don’t become the dust.*

— Dlaczego to pani płacze?

*Sie blieb in Auschwitz.*
*Ich blieb in Auschwitz.*

*Ani ohevet otah.*

І нічога не скажаш,
акрамя прыціхлага «так».

*Смерть — это навсегда.*



## Наста Кудасава

*г. Рагачоў*

***

ты не кліч, не заві,
толькі верасень – мой візаві.
колкі сівер і вусціш сівілы ў маёй крыві.
але кожным радком я малю цябе, любы,
жыві!
аддавайся дарогам, заблуквай у хмельных травах…
салаўіныя сэрцы кунеж,
заварожвай і княж!
так, бязлітасны час,
але жыць немагчыма інакш,
бо любоў ахінае сабой
свет няўрымслівы наш,
асвятляючы ўсё –
нават самую простую яву.

***

бо такія жывуць насамрэч толькі там, дзе тонка.
ну, а ўсё, што рвецца,
я складаю рупліва ў рукаў.
і пакуль мяне ненавідзяць чужыя жонкі,
я ўсплываю між вамі штодня паплаўком радка.
я кажу, вось – вецер.
кажу, вось – хлеб, а вось – дотык.
я кажу, вось самоты пражэрлівыя смаўжы.
гэта Бог, я кажу, прайграе па нябачных нотах
нас усіх.
а яшчэ я кажу табе –
лепш бяжы!
бо такія жывуць насамрэч толькі там, дзе тонка,
каб усё, што рвецца,
струной
стала ў горле начэй.
і пакуль дзесьці спяць сном ружовым мужы і жонкі,
я кажу – цячы, рака!
і рака цячэ.

***

зразумееш: ні даць, ні ўзяць –
можна толькі ззяць,
толькі слухаць зямлю, занурыўшыся ў пах вясновы.
і пакуль сакавіцкі снег, любы небу зяць,
абдымае яе сабой, парахнеюць словы.
і пяшчота нямой струной праразае боль,
каб ні даць, ні ўзяць, толькі ззяць
найсвяцейшай з музык…
зразумееш, любоў –
гэта штосьці заўсёды больш,
больш, чым могуць змясціць
нашых жыццяў маленькія шлюзы.



*Рисунок Юлии Работкиной*

## Елена Атай

*г. Минск*

### Мой город

Домой!
В сине-жёлто-зелёные улицы
В ночном красно-белом автобусе
Ворвусь.
На знакомых серых камнях
Сосчитаю морщины.
Как много!
Собьюсь со счета и рассмеюсь.
Мы с тобой повзрослели, мой город.
Ты встречаешь меня фейерверком
Фонарей, утонувших в лужах.
Воздух улиц твоих так нужен
мне был
В далеких чужих краях!
Мы похожи с тобой, мой город.
Ты и я.

### Время остановилось

Я знаю такое место,
Где остановилось время.
Оно стоит, как столб,
И не идёт ни вперед, ни назад.
Под ногами тот же пол.
На стене та же картина.
Серая дверь.
Четыре окна.
А в окнах – сентябрь.
Уже пятый месяц.
Передо мной человек,
Говорящий одно слово.
Уже пятый месяц.
Он не кричит.
Он говорит шёпотом.
Но этот шёпот зловещий.
И слово, сказанное им, означает,
Что сентябрь в окнах – навечно.

## Ірына Сідарчук

*аг. В. Матыкалы Брэсцкага раёна*

***

Пазбаў мяне ад нематы.
Дазволь глынуць чысцюткай мовы,
Якую ў сэрцы песціш ты.
Мне часам не хапае словаў,
Каб верш бруіўся, плёнам плыў,
Каб песню калыхалі хвалі,
Якой ва мне гучыць матыў,
Якую мы з табою склалі.



### Санет

А потым зноўку будзе снег,
Усе забудуцца пра спёку,
Ды нехта годны і высокі
Прымроіцца ў спякотным сне.

Таксама потым снег міне,
Вясна расцерушыць аблокі
І лета зноў накрые спёкай,
Гарачынёю агарне,

Атруціць харраством суніц,
Каб злёгку ажывіць парэшткі
Вадой русалчыных крыніц.

Нахабны месяц стане сведкай,
Як хтосьці пад сполах бліскавіц
У папараці знойдзе кветку.

***

Хрупкое равновесие
Жизни моей нарушено.
Сына звонок. Сессия.
Вслушиваюсь и слушаю:
«Пишу, мам, конспект по истории,
Лекции все – заочно,
Лишь лабы в аудитории.
Снова стояла скорая
Возле общаги ночью.
Припасы почти уже съедены.
Приказы о карантине».

Мешаю чай ложечкой медленно,
Сердце стучит о сыне.

* * *

И когда ничего не осталось,
Кроме неба, в котором светится
Мягким светом Большая Медведица,
Всю накопленную усталость
И мешающую условность
Я оставлю.
Пусть путник крестится,
Увидав меня рядом с Медведицей,
Ровно в полночь.





Рисунок Анастасии Зининой

## Марыя Мартысевіч

*г. Мінск*

* * *

На папялішчы Вялікага Цырка
бегаюць у кіча
хрысціяне й патрыцыі.
Хто першым кранецца пляча:
– Я Традыцыя!
– Не: я – Традыцыя!
Не замінайце ім:
тут вяршыцца расклад
на бліжэйшую тысячагодку:
хто тут будзе кічом,
хто тут зробіцца кічам,
хто тут сэнс, а хто «ні а чом»,
і каго па шыі мячом
або ўніз абліччам.
Хто per aspera, хто ad astra,
хто па венах і хто ad leones...

Зрэшты, не ўсё толькі кепскае
звязана было ў Рыме
з вядомым Неронам.




* * *

Бог
інфантыльны мужык,
што пакінуў дзіця на Зямлі,
мужчына-падлетак
які так і не вырас з сынам.
Знайшоў яго ўжо дарослага.
Ну, пытаецца, як жывеш,
як маці.
Цесля – гэта, канешне, добра,
але якія твае перспектывы,
і потым, гены –
іх не замажаш пальцам.
Язэп
з новым гэблікам у руках
(гэта меўся быць падарунак)
далікатна стаіць у баку,
усё разумее:
апека яшчэ тады
даступна ўсё патлумачыла.

* * *

Ісус
набывае сандалі
з натуральных матэрыялаў
у мясцовых вырабнікоў
адмаўляецца
ўязджаць у горад на вosліку
каб не цярпела жывёла
яму кажуць
прароцтва
рабілася вельмі даўно
нельга чакаць
ад тадышніх людзей
нашага ўзроўню свядомасці
а цяпер
галоўнае
апраўдаць чаканні
што да пальмаў
яны толькі лепш растуць
калі з іх абрываюць лісце
затое
бальшыня тых
хто вітацьме Цябе Настаўнік
гарантавана жанчыны

* * *

Ці вось яшчэ прыклад:
«Фольксваген» на вуліцы Леніна
бібікае на працэсію Corpus Christi.
А яна ніяк не сканчаецца.
Вернікі пазіраюць няўхвальна,
інкрымінуюць кіроўцу
знявагу да еўхарыстыі.

Кіроўца цадзіць праз зубы:
была страна как страна,
а тут, зыр, багамольнымі сталі, на...
Не ведае нават, каго на ўсіх іх няма:
Люцыфера ці Сталіна.
З гэтай во векавухай
вучыліся нават, здэцца, у аднэй школе,
а цяпер праз яе слухай
фінал Лігі Чэмпіёнаў па магнітоле...
Шамаціць эфэм-хвалямі, бэсціць:
у аплатцы вам стронцый...

І над усімі імі свеціць
халоднае мінскае сонца.

* * *

Мінчукі
трымаюць дзверы метро
беражліва
як хрустальны сасуд
спыняюцца на выхадзе
чакаюць ідучага следам
каб нікога не стукнуць

Перадаюць з рук у рукі
мужчыны жанчынам
маладыя старым
дарослыя дзецям

Я адшукала Грааль
ён у мінскім метрапалітэне

## Таццяна Цвірка

*г. Клецк*

### Трагедыі на Нямізе прысвячаю*

Плачуць кветкі на мёртвым граніце
Па юначым нязведаным шчасці.
Прыпыніцеся!
Памяніце!
Шлях да раю...
Пякучы.
Заўчасны.

Млеюць свечкі ў летняй спякоце,
Іх спагада сплывае воскам.
Людзі, немымі не праходзьце –
Спачувайце малітвай боскай.
Мы забылі аб мудрасці вечнай,
Дарагім самым ахвяруем.
Божа праведны, выбач нас, грэшных!
Божа міласцівы, даруй нам...

---

**У вершы 53 словы, у трагедыі – 53 ахвяры.*

* * *

Побач з табой
раскладваю ў жыццёвы куфар
па сваіх месцах
боль і горыч,
радасці і расчараванні,
памылкі і поспехі,
сумненні і шкадаванні,
успаміны і мары...
Побач з табой
лопаюся бурбалкамі,
каюся,
скідваю крылы...
Побач з табой
асляпляюся надзеямі,
спазнаю веру,
узвышаюся...
Шкада,
што прыходзіш так рэдка,
мая новая сяброўка,
мой лоцман,
мой дар божы –
Цішыня.



Рисунок @Neza-Saner

### Вершы-карацелькі

***

Разбудзіў наваколле
дзіўны барабанны дробат.
Чакайма ў гэтым годзе
ўнучачку ці ўнука:
буслы на даху!

***

Збегла Зараніца на прыволле.
Уплятае залацінкі свае
ў рамонкі, валошкі, мятлікі –
прыхарошвае перад пачаткам дня:
луг-цырульня.

***

Туліцца, лашчыцца
вусікамі чэпкімі, касматымі
(увесь свет прыгарнуць гатовая)
ліяна дзявочага вінаграду –
нявінніца.

***

Крэкча-рыпіць старая яблыня:
«Падладзь, спадарку, шпакоўню,
не дай памерці ў адзіноце!»

***

«Томка! Томка!» –
кінуўся гадавалы сыночак
за яркім матыльком.
Вось і назвіска табе,
мятлік-аднадзёнка!

***

За дзень
дзясяткі спелых дзетак нараджае
галінка маліны.
Сонцапёк!

***

Заразілася бацыламі словаблудства,
абвешалася фразамі-пустазвонамі...
Выпрамлю спіну,
страсу з плеч графаманію
і асядлаю Пегаса!



## Юля Цімафеева

*г. Мінск*

(З новай кнігі «ROT»)

### Дзеду

Я збіраю як летні ўраджай
вострыя
парасткі
джалаў
з тваіх худых
шорсткіх шчок

і складваю
чорнымі рыскамі
табе на далонь.

Старэчыя шчокі
не зызнуць
і ўжо не свярбяць ад болю
шчодра падоранага табе
пчоламі-самураямі.

Іх касматыя целы
што ляжаць пад нагамі
мы потым збярэм на савок.

А цяпер
наш адзіны
атракцыён –
мы весела круцім ручку
алюмініевай медагонкі

І ніхто не дагоніць нас
ніхто не спыніць –
хутчэй! Чапляючыся
за тонкія пруты сваіх кабінак
нясуцца па коле й вішчаць
вуглаватыя соты
бездапаможна і соладка льецца
праз чорную дзірку
у металічнай бране
першы сёлетні мёд.

Калі нам надакучвае ты
што моўчкі сачыў
за шумнаю валтузнёю
садзішся на ўслон і сам
здаволена круціш
нагрэтую дзіцячым цяплом
ручку.

Твой час сцякае
праз шчыльнае сіта
усеянае
бляднымі снамі лічынак
ліпкімі дробкамі воску
счарнелымі целамі
летуценняў.

Час цурчыць
і верціцца медагонка.

Верціцца,
Пакуль соты не выплачуць мёд.
Пакуль сіта не праглыне апошнюю
кроплю.
Пакуль не знікне сонца.
Пакуль не замлее рука.
Пакуль ты не ўздымешся ў неба
вечаровай пчалою.

### Бабулі

мяне стрыглі каротка
як хлопчыка
ніхто не ведаў
што свае тоўстыя цяжкія косы
ты адпісала мне

мяне вучылі казаць табе «вы»
быццам ты была не сама
ва ўласным целе

бо як бы сама ты змагла
вынесці тое
што мне й уявіць жахліва

але жахліва было табе
ў сцюдзёным балоце
пад цяжарам
цёмных кос

а я
твой скарб
аддала
за ссохлы
драбок свабоды
абрэзала
даўгую і тоўстую
пупавіну валосся

але і нябачная
яна напаўняецца
памяццю

тры гады мы прабавілі разам
а потым выправіліся
ў розныя падарожжы
пад зямлёю
і па зямлі

тваё імя ўплецена
ў маё імя
мае вочы сочаць
як ты
ў белай хустцы з цвятамі

плывеш

дзве манеты халодныя
на тваіх павеках бабуля
карункі яловых лапак
на саматканых абрусах
і разарваныя каралі
твайго голасу
звіняць россыпам гукаў
і не збіраюцца ў словы

зямля – гэта нашае мора
адрэзаўшы пупавіну
касы
ты ў лодцы драўлянай
сплываеш
да самага цэнтру зямлі

далей ад засланага снегам дзірвану
далей ад сухой і шорсткай травы
далей ад пожняў і ад азімых
далей ад комінаў і ад крыжоў

туды дзе цёпла і земляныя птушкі
пяюць танюткімі галасамі
што кожную з нас
аднойчы падхопіць лодка

і панясе

Марина Шадуя

*г. Брест*



## Март

По проталинам первым
Март идёт шагом верным
вдоль полей да заимок...
Но спешащий народ
впопыхах не заметил,
как легко солнца плети
сняли шубы с озимых
и крушить стали лёд.

Только вербы да ивы
видят речки разливы
и ветвями целуют
рано утром туман.
Им весной все неймётся,
видно, память смеётся
миражами рисуя
юной барышни стан.

И забытые лодки,
словно чудо-лебёдки,
не спеша проплывают,
чуть качая кормой...
Память время тасует,
ручейков вешних струи
на снегу оставляют
новый, дивный раскрой.

Вдалеке от дороги –
ни тоски, ни тревоги.
Всё степенно и чинно,
как и сто лет назад.
Март тихонько вздыхает,
а грачей чёрных стая
криком будит низину.
Птицы зиму казнят.

## Не ищите подвоха

Не цепляйтесь к словам, не ищите подвохов.
Не с моим оперением быть дипломатом.
Хорошо – я смеюсь. Плачу, если мне плохо.
Мысли часто сумбуром...
Не со зла.
Виновата.

Желторотым птенцом, за стрижами вдогонку,
в небо рвётся душа, но, видать, рановато:
отрыдает старухой, рассмеётся девчонкой,
и глотает отвар – то полыни, то мяты.

Неумелой рукой тку судьбы покрывало,
лоскутами мечты разбавляя реальность.
Жизнь, как песня, – сложилась.
Но мне мало всё,
мало...
Постоянно меняю мелодий тональность.

Солнце августа тучи пригладит лучами.
Дождь на капли рассыплет себя по дорожкам
и строкой обернётся.
А дальше вы сами
все поймёте,
прощая меня понемножку...



Жанна Усцінава
*аг. Гарбавічы Чавускага раёна*

## Байкава*. Мроі

Я пастаўлю тут свой зруб.
Зажыву на пакатым узлеску.
Пасцялю на стале абрус,
увесь затканы пяшчотай пралескавай.
А навокал – жывы плот:
лес Архіпаў глядзіць улюбёна,
як схапіў прагна Пронеў рот
струмень з Байкава намалёны.
Дзе сцяжынай віхляе луг,
на змярканні хадзіць мушу:
з дум змываць непатрэбны тлум,
паласкаць у ручаі душу.

* *Самая знакамітая крынічка ў Чавускім раёне.*

## Ляціць да нас птушка Лета

Ляціць да нас птушка Лета.
Хвіліны лічым да стрэчы.
Мы ёй не рыхтуем клеткі
у апошні вясновы вечар.
У клетцы?
З смарагдавым пер’ем?
Трохмесячны шлях сталення
мы будзем кідаць ёй зерне
бязмежнага захаплення!
А як Лета ля нас нацешыцца
ды натоліцца дзіўнай сілаю –
услед за ёй па нябеснай сцежачцы
прымчыць птушачка шчасця... сіняя.

## Ішоў Настрой

Ішоў Настрой бадзёра
вулкай звычнаю,
майскім шчодрым небам
аблакічаны,
рабацінnем сонечным
абвеснены,
жаўручыным пошчакам
апеснены.
У заплечніку ён нёс падзяк
абвешчанасць,
усіх напояў хмельных
перамешанасць,
шпаркіх дум вар’яцкую
арэлістасць
і надзей раптоўную
асмеленасць.

## Шпачок

Сцягнуў на ранні
коўдру сноў
з мяне пяюн падстрэхавы.
– Шпачок!
Шпачулька!
Ты ізноў з сакавіцкаю ўсцехаю!
Вярнуўся,
любы мой артыст,
у кут прамерзлы, ззімнены!
Паслухаць дзіўны сві-ві-віст
выходжу з сонцам
здзіўленым.
На тонкім провадзе ўгары
гушкаецца між гукамі:
старых вярбін тужлівы рып,
ручайнае буль-булькание,
ўсе трэлюлянні салаўёў,
свіст ветру мітуслівага...
і нават імечка маё,
у тваёй душы насімае.



## Зоя Новоенко
*г. п. Подсвилье Глубокского района*

### Утро в деревне

Заря сияет на востоке,
Подсвечивая облака,
Мелькает солнца луч далёкий,
С кустами шепчется река.

Петух слетел с высокой кровли,
Он честный люд будить готов,
Хозяйки вышли на подворье,
Чтоб гнать на пастбище коров.

Полканчик выскочил из будки,
Ему на ближних лаять лень.
Тропинка к речке. Незабудки,
Раскрыв глаза, встречают день.

Туман редеет. Тихо тает,
Роса устала луг знобить...
В деревне лето. Рассветает...
...картинок детства не забыть.



### Первый снег

Как счастью невесомому,
Как старому знакомому,
Седому снегу рада я –
Вокруг меня он падает.
Он шлепает по лужицам,
В небесном танце кружится,
В метели снег завьюжится,
Метель с зимою сдружится –
И занесут следы твои,
Но только не моей любви.
Не заметают памяти
Бураны, ветры, замети...
Снег первый гостем падает.
Как другу, снегу рада я.

## Ирина Карнаухова
*г. п. Мачулищи Минского района*

### Шли двое под одним зонтом...

Шли двое под одним зонтом:
На лицах отражалось счастье.
Погода со своим участьем
Любезно помогала в том.

Шли двое под одним зонтом,
Друг к другу крепко прижимаясь,
И, в целое одно сливаясь,
По лужам шлёпали с дождём.

Шли двое под одним зонтом,
Блаженствуя в потоках сильных:
Любви невидимые крылья
Несли в пространстве неземном.

А рядом с ними проплывал
С любимой Беллой Марк Шагал...



Рисунок @Neza-Saner

* * *

А в душе моей вечный храм:
В нём давно поселился Бог.
Там могу волю дать слезам
С просьбой, чтобы от бед сберёг.
Колокольный услышу звон –
Очищает он верный путь.
Мощной силою наделён,
Оставляя для веры суть.

### Я хочу туда вернуться

Я хочу туда вернуться,
Где все окна – нараспашку,
По утрам – какао чашка,
Песен много, хлеб вкуснее
И с друзьями веселее.
Мама с папой молодые,
Мы с сестрёнкой озорные,
В луже – беленький кораблик,
Чудотворный запах яблок,
Там в мечтаниях, как птица,
Можно в облаках кружиться.
Где беды нет по соседству,
Где легко, где счастье детства!
Я хочу туда вернуться...



## Лилия Высоцкая

*г. Брест*

***

Возраст –
незваный гость –
приходит без стука.
С охапкой цветов.
Вешает шляпу из фетра на гвоздь.
Без вредных привычек.
И старых врагов.
Он бодр и куражен. Умён. Ироничен.
Свободен в желаньях.
И в жалости груб.
Как фокусник, ловко жонглирует спичами,
затронув усмешкой
изменчивость губ.
Когда надоест удивлять и смеяться,
тихо уйдёт,
оставляя мне гвоздь...
И сколько его ни просили остаться,
он твёрдо скажет,
что только гость.



## Віктар Хмарук

*Брэсцкі раён*

***

Вышываны ручнік, абразы ў акладзе.
У спусцелай хаце замутнела шкло.
Маміны пацеркі ў верхняй шуфлядзе
Некранутыя ляжаць, захаваўшы цяпло.

Здзічэла маліна, плот пахіснуўся,
Пужлівы шуляк з грушы зляцеў.
Здаецца, я спаў і толькі прачнуўся,
І ўбачыў, што асірацеў.

На рэчцы пярэспа, змытая кладка,
Зманамі цешыць ранняя восень.
Маміны пацеркі – цёплая згадка,
Вабіць душу бяздонная просінь.

Маміны пацеркі ў верхняй шуфлядзе...

***

Пасля сябе што я пакіну?
Увесну – краскі,
Улетку – птушыны спеў.
У кнігах – чароўныя казкі,
Надзей і мрояў спадзеў.

Пасля сябе што я пакіну?
Клёны – увосень,
Узімку – вятроў варажбу,
Неба бяздонную просінь,
Па страчаных марах журбу.

Пасля сябе што я пакіну?..

## Галина Ничипорович

*аг. Могильно Узденского района*

### Весна

Блекнут зори, растворяясь
Под серебряным дождём.
Я в содеянном не каюсь.
Взявшись за руки, бредём
Мы по улочкам рассвета,
На песке блестят следы.
Пусть сомненья стынут где-то,
Рядом ты и только ты...
Дышит свежестью прохлада
У излучины реки.
Замираю я от взгляда
И касания руки.
Пью глотками, наслаждаясь,
Чувство — как бокал вина.
Я в содеянном не каюсь,
Ведь виной тому — весна!



## Рэгіна Рэўтовіч

*в. Станькава Дзяржынскага раёна*

### Першая навальніца

Маланкамі прасякнуты абшар,
Здаецца – ніц абрынуцца нябёсы,
Налітыя цяжарам чорных хмар.
Знямела ўсё ў чаканні безгалосым.

Вясновы гром раструшчыў цішыню,
Зайгралі гучна бомы дажджавыя,
Нясуць яны адноўленаму дню
Вясны абдымкі – чыстыя, жывыя.

А хмара адплыве ў далечыню,
І дзесьці ўспыхне водблеск бліскавіцы...
Жыцця струмень, пяшчоту, чысціню
Нам шле вясна ад першай навальніцы.

### Май

Як жа мне не любіць той малінавы рай,
Дзе ў світанках шчыруе расквечаны май,
Дзе клякочуць спрасонку ў буслянках буслы
І даносіцца з поплава спеўна «курлы»,
Дзе па сліве паўзе, завіваецца хмель,
Дзе ў траве клапатлівы пазумквае чмель,
Дзе ў прысадах распеўкі заводзяць дразды...
Хай бы так на планеце жылося заўжды!

### Хаціна

Нібыта здань, стаіць хаціна
Супроць цывільных дач, платоў,
Глядзіць з падвояў павуціна
Яшчэ з мінулых тых гадоў,

Калі, у апошні шлях сабраўшы
Хаўрус бязлітасных хвароб
І лёс свой здзеклівы пракляўшы
За дзён гаротных расцяроб,

Жанчына слёз ліла пакуту
За долю трох сыноў сваіх –
Не даражыць ім родным кутам,
Не абышла нядоля іх.

Раслі гарэзамі на волі,
Нібыта жыта каласкі,
Насупраць хаты тры тапалі
Садзілі дружна хлапчукі.

А лёс ім слаў свае заганы,
Нібыта чый шугаў праклён,
Нібы было наканавана –
Тапіць у чарцы ласку дзён.

Прысуд на згубу несла ліха
Сынам, таполям і платам...
Як над буслянкаю бусліха,
Душа жанчыны кружыць там.



Рисунок @Neza-Saner

## Ядвіга Доўнар

*г. Дзяржынск*

### Двух вымярэнняў дзіўны след

І подых крыльцаў матылька,
І шум далёкай электрычкі,
Няспешнасць крокаў – новай звычкай
Трымаеш вечнасць у руках
За край бязмежнасці касмічнай.

Двух вымярэнняў дзіўны след
Вядзе ў Драздовіча сусвет.

На міжпланетных скразняках,
Дзе зор гуртуюцца суполкі
Не стыць жыцця аскепкам колкім,
Пакуль гарачых вен рака –
Як ратавальны мост вясёлкі.

На тым і гэтым берагах
Святло душы будуе гмах.

Падмуркам вечнасці скрыжаль
І вечнасць словам запаветным...
А росы знічкамі дрыжаць,
На палатне – смарагды лета,
І дыванком Язэпа кветкі...

Вандруе вечная душа...
Што ёй умоўная мяжа?

Марыя Шакун

*г. Валожын*

## Матуліна святло

Мая душа дамоў імкнецца,
Маркотна ёй усюды,
Бо толькі дома мне пяецца,
У краі маім любым.
Бо толькі тут мае сябры
І родныя мне людзі,
Бо толькі тут мае бары,
Усё, што было і будзе.
Мне салавейка па вясне
Спявае да світанку,
Праменьчык сонейка ў акне
Цалуе мяне зранку.
Бо тут матуліна святло,
Яе тут калыханка
І тая сцежка за сялом,
І белы бэз ля ганку.
Тут п'ю я водар верасоў
І яблыкаў паспеўшых,
А хмаркі музыкай дажджоў
У далоні сыплюць вершы.

## Сцяжынка

Сцяжынка ад парога хаты
У край далёкі павяла.
Ды помніла я словы таты:
– Не забывай свайго сяла.
І з той пары заўжды са мною
Сцяжынка тая, тая хата,
І луг з духмянаю травою,
І ніва, што яшчэ не зжата,
Рачулка з чыстаю вадою,
Мае сунічныя палянкі,
І неба сінь над галавою,
І мама ў хустачцы на ганку.
Радзіма мілая, малая,
Хто без цябе я ў гэтым свеце?
Як маці, ты мне дарагая,
Такая ты адна ў Сусвеце.

## Сенажаць

Як за рэчкай, за ракой
Працавалі талакой,
Сенажаць касілі,
Сена там сушылі.
Гэта сена-сенажаць
Шмат магла бы расказаць
Пра дзянькі і ночкі,
Закаханых вочкі.
Ой ты, лета-лецейка, трава-медуніца.
Ой, дзяўчына мілая, песня-чараўніца.
Дазволь наталіцца тваёй прыгажосцю
І налюбавацца тваёй маладосцю.
Як за рэчкай, за ракой
Сэрца страціла спакой
Ад тых слоў жаданых,
Вуснаў палымяных.
І дурманіць галаву
Гэта казка наяву,
Свежыя пакосы,
Лугавыя росы.
Ой ты, лета-лецейка, трава-медуніца,
Ой, дзяўчына мілая, песня-чараўніца,
Дай жа наталіцца тваёй прыгажосцю
І налюбавацца тваёй маладосцю.



Вольга PALUNISA

*г. Маладзечна*

## Смарагд



На ўскрайку лесу мяне сустрэла лёгкая, паўпаветраная, але абсалютна фізічная істота і прапанавала ісці за ёй. Я з удзячнасцю пагадзілася і рушыла. Ступіла нагой у зялёны духмяны лабірынт. І адразу знікла адчуванне часу, і рэальнасць перайшла ў іншае, шматграннае вымярэнне. Рух адбываўся ў любым накірунку, страцілася адноснае адчуванне верху-нізу-права-лева-наперад-назад. Віры і пераскокі, пашырэнне і зноў з'яднанне ў моцны струмень, аддзяленне ад яго, рассыпанне і збіранне ў прыгожы пакручасты пялёстак. А пасля – зарападам у келіх! Старажытны келіх, які ў самым цэнтры, вельмі ўмоўным. У самай глыбіні гэтага смарагдавага лесу. Поўны святла і ззяння! Залаціста-ружовага з перламутрам, з салодкім пахам. Поўны чароўнага напою келіх!

Рукі мякка апускаюцца ў напой. Павольна вымаю іх і назіраю, як ад іх ідзе свячэнне – ад вадкага мёду, які сцякае.

Быць у гэтым стане. Пабыць, не ўтвараючы вобразаў, слоў, думак. Пабыць нерухома, бяздумна, у абсалютным кропкавым быцці. Каб як мага лепей адчуць сваю еднасць з ім і сваё прамое і непасрэднае дачыненне да яго. Каб злавіць тонкае дыханне сутнасці.

## Крынічанька



Дымок ад спаленых пахошчаў мінулых падзей, што застаўся толькі шэранькім бязважкім попелам на далоні. Тое, што было даўней. Тое, што толькі асадак, пах, успамін. Чаго зараз ужо няма. Што было некалі альбо ўчора. Гэты паветраны шэры пыл – усё, што ёсць зараз. І варта расслаблена і з палёгкай уздыхнуць, як ён разляціцца ва ўсе бакі і знікне, быццам і не было яго зусім.

Цёплым тонкім пахам мінулага досведу напаўняецца вялізны паветраны шар! Я залязаю ў плецены кош, прымацаваны да яго, і ўзнімаюся над зямлёй, над сабой, над падзеямі майго жыцця. Над прыемнымі і над тымі, праз якія адчувала боль. Усе яны раздзьмуваюць гэты шар – ён зараз павольна і ашчадна нясе мяне над лясамі, што хвалююцца, раўнінамі, якія расцякаюцца ўнізе. Над аблокамі і зіхатлівымі рэчкамі.

Недзе далёка, падчас самых першых промняў пасля ўзыходу сонца, мой шар мякка апусціцца ў маленькую даліну, як каронай абрамленую гарамі з надзвычай чыстым паветрам. Яркага колеру зеляніна, кветкі, сады і проста дрэвы, дрэўцы, кусты. З майго пупка пачынае свой шлях крынічанька. Яна выцякае ручаінкай у даліну і ўсмоктвае яе прыгажосць, убірае ў сябе яе дзікую першароднасць. Паміж гор яна знаходзіць цясніну і рушыць па ёй. Бяжыць па каменьчыках, камянях, прымаючы воды, якія далучаюцца да яе, робячыся ўсё шырэй, інтэнсіўней, упарцей. З парогамі, вірамі, буйным цячэннем! Дабягаючы да краю абрыву, яна кідаецца ўніз вадаспадам, рассыпаецца на безліч кропель і далятае да падножжа скалы толькі парай.

Асядаючы возерам, збіраючыся ў яго, даўшы сваёй вільгаці тым, хто чакаў гэтага тут, яна працягвае свой шлях ракой. А перад ёй адкрываецца раўніна. Гаманлівая, яркая, птушыная, звярыная, жывая, напоўненая, пладародная, удзячная і шчырая.

Раўнінай рака выходзіць да акіяна. І там сотнямі пальцаў утыкаецца ў яго! Бяздонны. Бязмежны. Бясконцы. Вялікі. Магутны. Усёабдымны, як сама Любоў. Рака зліваецца з Акіянам. Рака ўліваецца ў Акіян. Рака прымае Акіян. Рака прымае Усёабдымнасць і Любоў.

**Выцінанкі**
**Вольгі БАБУРЫНАЙ**

## Ирина Фомина

*г. Брест*

* * *

Нерешительная весна. Ливнем не умытая. Осторожничает. Несмело подкрадывается. Цветёт, а не пленяет. Пахнет, а не дурманит.

Тактика, видимо, у неё такая: молчанием и робостью в плен взять. И постепенно козыри свои раскинуть: ландыши, грозы, пчёлы. И очаровать. И потом уже до самого лета не отпускать...

* * *

«*Есть время в природе особого цвета...*» И совсем не обязательно это бабье лето. И скорее даже не цвета, а цветения.

Пару недель на грани апреля и мая.

Цветы, серёжки, листья. И нет в них торжественности и обязательности. Есть деликатность и откровенность. И немного храбрости первопроходцев.

Притягивает взоры живое молодое разноцветье. На ветру колышется, лепестками осыпается, пчелами-букашками опыляется.

И есть что-то особое в этой быстротечной смене цветущих декораций, внутренне-ненавязчивое. И красота эта не восторг вызывает, а скорее приступы нежности и тихой грусти.

И кветень эту всю подольше сохранить хочется. Не в фотографиях. Скорее в ощущениях...



* * *

«*Только о двух вещах мы будем жалеть на смертном одре – что мало любили и мало путешествовали*». Марк Твен.

Жалеть не хочется. Ни о чём. По возможности стараюсь путешествовать. Чаще в ближайший лес, иногда – в дальние страны.

Разные города и народы. Каждый со своими особенностями. Что-то ожидаемо впечатляет, что-то неожиданно шокирует. Выпадаешь из реальности, в хорошем смысле этого слова. Окунаешься в образ безмятежного туриста. Долго так жить не будешь. Но иногда просто необходимо.

Я дорогу люблю. Даже после длительных переездов усталость тела проходит. Ощущение бескрайности просторов остаётся.

В поездках не шикую. На экскурсиях и впечатлениях не экономлю. Экономлю на обедах. Таким образом ещё и дополнительное время освобождаю: побродить одна, посидеть на скамейке в парке, поймать темп города, услышать его дыхание и музыку.

Сувениры не скупаю. Фотографий делаю немного. Здесь и сейчас – это важно. Чувство города увожу с собой. Позже подпитываюсь, как от внутренней батарейки.

При желании в жизни многое возможно. Не стоит искать препятствия. Лучше создавать волшебство. Себе и другим.

Возвращаясь, убеждаешься: близкие – лучшие. Все города хороши, но жить нужно дома...

* * *

Люблю я всё вот это. Отчаянно люблю. Или, скорее, трепетно. И зелень эту нежную, и сады благоухающие, и черёмуховые заросли, и каштановые соцветия-свечи. Весь год живу в подспудном ожидании времени роскошного цветения. Не только взирать люблю. Тактильные ощущения обожаю. Лепестков коснуться, листья погладить, к коре прижаться. И запах уловить. Не пыли и гнилости, а свежести и озона.

Есть ещё одно время, которое мне сходно симпатично. Осень. Не ранняя, пожухлая. И не ноябрьское межсезонье. А та самая, «особого цвета». Когда все оттенки охры в природной палитре смешались. Когда бродить среди деревьев хочется, замечать и примечать.

И поры года эти во мне отнюдь не соперничают. Мирно уживаются. И с отношением к зиме совсем не спорят. С ней у меня особая история, родственная.

Вообще в моей жизни столько любви всеобъемлющей, что порой кажется: не на один сезон её хватит. Не на одну жизнь...

* * *

Не любить её невозможно. В ней столько всего необыкновенного. Потому и люблю.

За зелень и охру.

За холодную рябь воды и шорох опавших листьев.

За утренний туман и вечернюю изморось.

За журавлиный клин и опустевшие гнёзда.

За антоновку и рябину, за орехи и грибы, за хризантемы и каштаны.

За неспешные прогулки и вечера при свечах.

За чай с корицей и глинтвейн.

За слова и строчки, которые витают в воздухе, успевай только записывать.

Впрочем, любят ведь не за достоинства. Это для разочарования основания нужны. А любовь... Любовь она по умолчанию. Или есть, или её нет.

Валентина Быстримович
*г. Минск*

# Женское счастье бывает

Многие современные женщины словосочетания «женское счастье» не признают. Говорят — есть просто счастье. Рассказывают о карьере, самодостаточности, достижениях, равноправии, самореализации... Но я точно знаю — женское счастье есть.

Бывает счастье рыбака — когда клюет. Бывает счастье моряка — когда ветер в корму. Бывает счастье альпиниста — когда под ногами покорённая вершина. Счастье бывает разным, и у каждого своё. Победа, удача, выигрыш, открытие, достижение — всё это счастье, радость. Но женское счастье по природе своей особое.

Спросила у дочки:

— Есть ли счастье женское?

— Нет, — ответила она. — Есть просто счастье. У меня такие же требования и запросы, как и у мужа, — карьера, успех.

Я тоже делала карьеру, добивалась успеха, стремилась к признанию. Были у меня счастья-радости: получение диплома, назначения на должности, победы в бизнесе, окрыляющая и несущая к звёздам любовь. Но настоящего женского счастья так и не дождалась...

* * *

Я провела своё детство у дедушки Азара и бабушки Прасковьи в деревне Ямница Могилёвского района, им было за пятьдесят. Худенькая, с натруженными руками и бельмом на глазу (последствия несчастного случая на полевых работах), бабушка оставалась красивой. Не раздумывала она о том, есть ли женское счастье, — а оно у нее прижилось.

Дедушка был крепким, дочерна загоревшим, с выправкой былого солдата, рассудительным. Поженились они ещё до войны, и дети родились до войны. Азар ушёл воевать, как и все мужчины из деревни. Прасковья осталась с двумя детьми на оккупированной территории. Деревню сожгли немцы, до конца войны жила с детьми в землянке.



А. П. Ткачёв, С. П. Ткачёв «Май 1945 года».



Голод, холод, хлеб из желудей, мёрзлая картошка, собранная в поле под снегом. Когда трава пошла, ели крапиву, мокрицу. От тифа всей семьёй плашмя лежали на полу землянки. Выжила Прасковья и детей сохранила. Каждый день молилась о спасении мужа.

Дошли слухи, что Азар в плену под Слуцком. Зима, лютый холод, ехать более трёхсот километров, в лесах — волки, на дорогах — немцы. Оставила Прасковья детей под присмотром матери и сестёр, поплакала и поехала с дедом Митрофаном в далёкий Слуцк на телеге. Ей мать золотую копейку дала, с царских времен припрятанную, свой перстенёк в платочек завязала. Родня собрала в дорогу хлеба, сала и яиц — последнее отдавали.

Говорили, что немцы за золото и продуты выпускали пленных, если жёны за ними приезжали. Дорога шла через лес. Завьюжено, снежно, волки то справа, то слева воют. Потом на протяжении пяти километров с чисто немецкой точностью — виселицы через каждые сто метров. На груди повешенных доски с надписью: «Я партизан».

Лошадь шарахалась и стригла ушами то ли от волков, то ли от покойников, то ли от всей этой жути. Каждый, переживший войну, скажет: «Всё выдержим: и кризис, и дождь, и засуху, главное, чтобы войны не было». В деревнях останавливались на ночлег. Люди пускали. Общее горе всех сделало ближе.

Доехали. Сердце разрывалось, когда глядела Прасковья на худых, измождённых, голодных солдат за колючей проволокой. «Забери меня, женщина, — просили некоторые. — Я всё умею делать». Но она искала своего: «Ищу Азара. Не слышали?» — спрашивала. Нашлись, кто знал. Сказали, что Азар бежал, вроде, убит. Не нашла мужа, но что убит — не поверила. Выкупили одного солдата и вывезли, спрятав в сене на дне телеги. Всей деревней выходили, ушёл в партизаны. Ничего о нём больше не слышали.

Весть по селу разнеслась: «Азара убили». Не плакала Прасковья, говорила: «Жив Азар, сердцем чую». И родне запретила говорить, что погиб. Детям сказала: «Отец придёт». Удивлялись односельчане: как каменная — ни слезинки.

А Азар несколько раз бежал из плена. Его ловили, собаками травили, били, но выжил. После войны в лагерь под Челябинском сослали, как «бывшего в плену». Пять лет отработал и только оттуда смог сообщить, что жив.

Десять лет прошло. Уходил на войну — дочке Танюшке было пять, а вернулся — почти шестнадцать. Она не узнала отца, когда тот во двор вошёл, позвала мать: «Мама, какой-то дядька!» Поняла, кто, когда мать заголосила и бросилась мужчине на грудь. И сама подбежала и обняла.

Когда вернулся Азар, построили дом, из времянки выбрались и зажили как все. Я никогда не слышала, чтобы они спорили или повышали голос. В их взглядах всегда были тепло и любовь. Подарком судьбы было для Прасковьи возвращение Азара. Всегда об этом помнила. Они ценили дарованное судьбой счастье быть вместе. Трудились много. Работа, как и день, начиналась с рассветом и прекращалась с закатом. Но как они ценили то время, которое им осталось!

Много одиноких женщин было после войны. А Азар — мужик видный. Женщины с него глаз не сводили, сами проявляли инициативу, но не прельщался Азар, отшучивался или говорил, что для него лучше Прасковки никого нет. А Прасковья не злилась на женщин — война ведь мужчин забрала — и верила Азару.

По вечерам, когда корова была подоена, куры и свиньи накормлены, подстилка скоту подброшена, приходили к ним в дом соседки, одинокие женщины. Приходили скоротать вечер. Дед Азар сидел у стола, женщины – на лавке у стены, а я сидела на печке. Приходили как бы по делу, спросить: «Где будут наделы отавы давать? Не пора ли косить начинать? Где трава лучше?» Прасковья приглашала пройти в хату, и люди проходили, садились на лавку и начинали степенный разговор о погоде, косьбе, молотьбе.

Прасковья светилась лучами женского счастья, льющегося из сердца. Она топталась у печки, готовила на завтра корм скоту, но вместе с тем шутила, смеялась, и для каждого у неё находились добрые слова и утешение. Каждый вечер в доме собиралось человек семь или восемь. Заходили на огонёк.

Только спустя время я поняла, что люди приходили погреться в лучах хотя бы и чужого, но счастья. С тех пор, как вернулся Азар, поселилось оно в доме. Оно не было громким, броским и ярким. Было тихим, ясным и лучистым, было в глазах Прасковьи, в голосе, в дыхании. Заполняло углы, пронизывало пространство и впитывалось в стены. И люди не хотели уходить из хаты Прасковьи и Азара.

И мне было хорошо сидеть на печке, слушать их и на всех смотреть. А когда приезжал из города сын Николай, народа приходило больше. Работал Николай следователем и рассказывал разные истории о других народах, войнах, нравах. Он говорил, а все слушали. В глазах Прасковьи была гордость за сына, но она её тихонько прятала, чтобы другие не чувствовали себя обделёнными.

В последующей своей жизни я никогда не видела таких счастливых людей. В тяжёлом труде, в болезни и в горе они были поддержкой друг другу. Лучистое оно, счастье женское. Его нельзя спрятать — оно светится. Всю жизнь я мечтала о таком счастье. Кто-то, наверное, с сарказмом скажет: войны не хватило.

Галіна Пшонік

## Валошкі

Дом быў новы, высотны, «слупок» з адным пад'ездам. Зямлі перад домам было мала, і жыльцы суладна вырашылі адвесці яе пад клумбу. Купілі ў Батанічным садзе насенне, цыбуліны, клубні, расаду розных кветак элітных гатункаў і высадзілі ўсё гэта каля пад'езду.

Жыльцы высотнага дома былі пераважна людзі дзелавыя, занятыя, таму даглядаць клумбу ўзялася бабулька з першага паверха, перад вокнамі якой і аказаўся кветнік. Яна старанна рыхліла і палівала зямлю, вырывала пустазелле. Неяк, ужо ўзяўшыся за танклявы зялёны парастак, руплівіца задуменна адвяла руку і пакінула сцяблінку на клумбе. Праз колькі часу на сцяблінцы вырасла невялікая пяшчотная сіняя кветка.

– Гэта кветка не нашага кшталту! – ганарыста ўзняла вытанчаны бутон ружа.

– Які прымітыўны колер! – расправіў свае пялёсткі з мудрагелістай афарбоўкай касач.

– Ані пышнасці, ані росту! – дэманстратыўна выпрастаўся гладыёлус.

Іншыя насельнікі клумбы таксама не ўхвалілі з'яўлення неспадзяванай суседкі.

– Як вам не сорамна! – прысароміла іх бабулька, што, натуральна, разумела мову кветак. – Гэта ж валошка! Яна прыносіць весялосць і радасць. Праўда, не разумею, якім цудам валошка з'явілася ў горадзе, ля нашага дома.



А цуду ў гэтым выпадку ніякага не было. Высотны дом месціўся перад самай кальцавой дарогай, на краі горада. З другога боку кальцавой дарогі, крыху паводдаль ад яе, знаходзілася жытнёвае поле, на якім між каласоў раслі валошкі. Мінулай восенню ўсюдыісны верабей ласаваўся зярняткамі на жытнёвым полі. Да яго мокрых лапак прычапілася семечка валошкі. Потым верабей пераляцеў праз кальцавую дарогу, прысеў акурат на клумбу перад высотным домам і ўціснуў такім чынам семечка ў зямлю паміж элітных кветак. Бабулька, якая палову жыцця пражыла на вёсцы, робячы праполку, пазнала расліну і не схацела вырываць яе.



Усе насельнікі клумбы шчыра любілі бабульку, што так самааддана клапацілася пра іх. Яны паверылі сваёй апякунцы і пачалі чакаць весялосці і радасці ад валошкі. Валошка ж захоплена любавалася і вытанчанасцю бутонаў ружы, і мудрагелістасцю афарбоўкі касача, і стройнасцю гладыёласу, і разнастайнай прыгажосцю астатніх кветак на клумбе. А яшчэ яна ўдзячна падстаўляла сонцу сваю сінюю галоўку і ашчадна лавіла кожны яго прамень.

Першым адквітнеў касач, потым – ружа, потым гладыёлус і большасць іншых насельнікаў клумбы. Валошка спачатку крышачку паружовела, а там і ўвогуле пабялела. На месцы пабялелых пялёсткаў

утварыліся прадаўгаватыя семечкі з маленькімі чубкамі. Чубкі складаліся з валаскоў, якія мелі невялікія зазубрынкі па краях. Гэтымі зазубрынкамі семечкі хвацка чапляліся за зямлю і распаўзаліся па клумбе.

Наступным летам паміж элітнымі кветкамі весела засінелі шматлікія валошкі.

– Якая цікавая дызайнерская клумба! Ніколі не бачыў на гарадскіх газонах валошак, – зазначыў мастак, што накіроўваўся ў госці да аднаго з жыльцоў высотнага дома. – Абавязкова напішу іх.

Раніцай ён прынёс эцюднік, алейныя фарбы, пэндзлі і ўладкаваўся перад клумбай. Дзеці з цікаўнасцю заглядвалі на палатно. Дарослыя далікатна праходзілі міма, хіба што крышачку прыцішваючы крок. Бабулька з акна з гонарам пазірала на сваіх гадаванцаў. Увечары карціна была гатова.

– Які нечаканы пейзаж атрымаўся! – ухваліў працу сябар мастака, да якога той і прыходзіў у высотны дом. – Якраз да восеньскай выставы паспеў.

Мастак зняў пейзаж з эцюдніка і асцярожна, каб не размазаць яшчэ не высахлыя фарбы, панёс у майстэрню. Да сваіх гадаванцаў спусцілася бабулька.

– Бачыце, я ж казала, што валошка прынясе весялосць і радасць! Цяпер вам не страшна і адквітнець. Ваша прыгажосць назаўсёды застанецца на карціне і нават узімку будзе весяліць і радаваць людзей.

Кветкі ўзбуджана зашапацелі пялёсткамі. Сінія валошкі адчувалі сябе імянінніцамі.



Малюнкі: Лілія АБРАЗЕЙ



Святлана Агеявец
*г. п. Ружаны Пружанскага раёна*

## Велікодны звон

Святочны Велікодны звон
Ляціць да самых да нябёс.
— Хрыстос уваскрос! — гаворыць ён, —
Выратаванне ўсім прынёс.

І веру, што не згасне свет,
Не ступіць цемра на парог.
Ці будзе існаваць сусвет –
Рашае гэта толькі Бог.

Вялікдзень. «Сапраўды ўваскрос!» —
Здалёк даносіцца ў адказ.
Рай існуе. Ісус Хрыстос
Сябе ахвяраваў за нас.

Жыццё зямное — у вечнасць шлях.
Прайсці ім зможа толькі той,
Хто ў веры ўбачыў сэнс жыцця,
Любоў у дарогу ўзяў з сабой.

Вялікі дзень настаў для ўсіх.
Хоць улада цемры ўсё мацней,
Любоў і вера возьмуць верх
У бітве за сэрцы людзей.

## Не абяцай

Не абяцай зняць зоркі з неба,
Каб нам нагадвала іх ззянне,
Што кожную сустрэчу трэба
Чакаць, як першае спатканне.

Не абяцай мне птушку шчасця
Злавіць за морам-акіянам,
Каб спеў яе прагнаў напасці,
Бальзамам быў сардэчным ранам.

Не абяцай папараць-кветку
Знайсці ў цішы купальскай ночы,
Каб зведаць таямніцы свету,
Валодаць усім, што бачаць вочы.

Не абяцай, што будзе вечным
Каханне, узніклае між намі.
Усё зменліва пад Шляхам Млечным,
І з часам зменімся мы самі.

Адно прашу: са мной будзь шчырым,
Слоў не кідай пустых на вецер.
Не абяцай, што не пад сілу
Зрабіць нікому ў цэлым свеце.

Алена Масла

*г. Мінск*

## Прывал у Выцінанкавым лесе

### З казачнай аповесці «Прынцэса Румзаніда ў Краіне Лялек»

*Жыла-была прынцэса Румзаніда. Яна дамагалася ўсяго, чаго зажадае, праз крык і слёзы. Аднойчы так разышлася, што тупаннем ножак загнала пад зямлю сваё каралеўства. Каб ратаваць яго, прынцэса пускаецца ў падарожжа па незнаёмай Краіне Лялек. Аднак ці такая ўжо незнаёмая гэтая краіна? Вандруючы, Румзаніда робіць адкрыццё: Краіна Лялек – як паралельны сусвет, дзе аджываюць яе гульні і забаўкі. Салонае мора з яе слёз нарабіла бяды і тут. Каб прайсці па Краіне, прынцэса мусіць навучыцца розным рамёствам і выправіць разбурэнні.*

*У вандроўцы Румзаніду суправаджае Варона – жыхарка Краіны Лялек, выпадковая знаёмая.*

Дзьмуў моцны вецер, ляцець Вароне супроць яго было цяжка – таму Румзаніда маўчала. Да таго ж, яна баялася скуліцца ўніз, як зусім нядаўна сніла, і згубіцца. У чаканні зручнага моманту дзяўчынка сцішана назірала, як згасла ў небе поўня, як патухлі зоры і пачало святлець неба. Урэшце прынцэса задрамала, затуліўшыся ў пёрках птушкі. Калі ж абудзілася, Варона ляцела сярод карункавых крон незвычайнага лесу.

Дрэвы, кусты, кветкі – усё ў гэтым лесе было папяровым і ўражвала вытанчанасцю і дакладнасцю форм.

– Дык гэта ж Выцінанкавы лес! – ахнула Румзаніда.

– Зараз даведаемся, што тут робіцца, – падала голас Варона.

Птушка села на паляну. Румзаніда, баючыся патаптаць выцінанкавае хараство, нясмела ступіла на карункавы дыван з кветак. Але кветкі нават не закалыхаліся! Румзаніда глянула вакол, перавяла позірк на свае рукі-ногі – і пабачыла, што і сама яна, і Варона сталі танюткімі і бязважкімі, нібы з паперы. Яны хадзілі па палянцы, зусім не шкодзячы ёй.

Раптам дрэвы зашапацелі, кусты расхінуліся – і на палянцы з'явіліся папяровыя чалавечкі. Яны ішлі на высокіх хадулях і неслі на плячах насілкі з тронам. На троне сядзелі важныя асобы ў каронах.

Гарольды затрубілі ў трубы і галасна абвясцілі: «Іх Вялікасці Папяровы Кароль і Папяровая Каралева, уладары Кардонных, Крэйдаваных, Гафраваных ды іншых зямель, а таксама Выцінанкавага лесу!»

Яна памкнулася папраравіць сваю карону на галаве – кароны не было! Відаць, згубілася падчас палёту! Румзаніда ледзь не расплакалася, але ўчас спахапілася. Плакаць у Выцінанкавым лесе – вялікая небяспека, прынцэса ўжо ведала. Яна толькі хацела спытаць Варону, ці нельга палётаць над лесам ды карону пашукаць, як агледзела, што птушкі і след прастыў.

Не апускаючы на зямлю трон і не злазячы з хадуляў, папяровыя чалавечкі адвязалі з-за спін драбіны, якія цягалі за сабой, і прыхінулі да памоста.

Тут жа з травы паказаліся некалькі папяровых малюпасікаў. Яны хуценька ўскараскаліся па драбінах на памост і ціхутка зашапталі на вуха каралю і каралеве.

«Мясцовая выведка», – беспамылкова вызначыла прынцэса.

Яна стаяла, схіліўшы галаву, – як і належыць стаяць перад каралём з каралевай. Тым больш, калі свая карона згубленая. І нават радая была, што кароны няма. У караля быў такі злосны выгляд, такія вырачаныя вочы, што Румзанідзе зусім не хацелася прызнавацца, што яна – гэта яна.

– Ну і хто ты такая? – зусім не ветліва спытаў Папяровы Кароль. Гаварыў ён, нібы старонкі кнігі ветрам шкуматала.





– Зінаіда! Я – Зінаіда! – на хаду прыдумала прынцэса.

– Хм! – пагардліва хмыкнуў Папяровы Кароль. – А вось выведка дакладвае, што ты – прынцэса Румзаніда, праз якую ў Выцінанкавым лесе дрэвы павыварочвала.

– Будзьце справядлівым, Кароль! – загаварыла Папяровая Каралева і склала папяровы веер, якім да гэтай пары прыкрывала твар. – Выведка, між іншым, дакладвае таксама, што Выцінанкавы лес адноўлены. І шмат дзе ён стаў нават лепшым, чым быў!

Гаварыла Папяровая Каралева спакойна, нібы старонкі кнігі гарталіся паволі. Твар яе, у адрозненне ад твару Караля, вылучаў лагоду. Румзаніда ажно дзіву давалася – такімі рознымі выглядалі Кароль з Каралевай.

– Няхай сабе! – ані не падабрэў Кароль. – Але ж гэта праз яе слёзы скрозь было мокра і сыра! Той-сёй з нашых папяровых падданых нават ногі праз сырасць страціў! Праз гэтую плаксу мы забыліся, што такое хадзіць па карункавай траве! Мы мусілі стаць на хадулі! Гляньце ўважліва, Каралева, і будзьце шчырай сама з сабой! Каго вам шкада больш – свой папяровы народ ці гэтую разбэшчаную дзеўчынёшку, якая, да таго ж, ілжэ!

Румзаніда то палатнела, то чырванела. Пра яе гаварылі, як быццам яе тут і не было. А самае прыкрае – гаварылі праўду! Яна была памкнулася нешта сказаць, але гэта яшчэ больш раз'юшыла Папяровага Караля.

– Прынесці сюды нажніцы! – загадаў ён. – Справядлівым будзе гэтай прынцэсе такасама адцяць нагу!

Румзаніда страшна спалохалася! Яна зараз была бязважкай, танюткай, і нішто не замінала здзейсніць загад Караля. Тым больш што нажніцы, вялікія і вострыя, служкі ўжо вывозілі на высокай цялежцы. Папяровая Каралева адчайна шаптала Папяроваму Каралю на вуха, імкнучыся абараніць прынцэсу Румзаніду, але Кароль быў няўмольным.

Румзаніда падрыхтавалася да горшага – і раптам згадала, што ў Выцінанкавым лесе, як і паўсюль у гэтай Краіне, лялькі нічога самі паправіць не могуць. Нажніцамі арудаваць яны таксама не ўмеюць! Зблізу яна ўжо нават разгледзела, што нажніцы – не сапраўдныя, а зробленыя з кардону і абкручаныя бліскучай фольгай. Прынцэса ледзь не рассмяялася, але мусіла стрымацца.

– Ваша Вялікасць! – пачціва сказала яна. – Я не адмаўляю сваёй віны. Але ж калі вы пакараеце мяне зараз, хто дапаможа папяровым чалавечкам? Я магу зрабіць для іх новыя ногі!

– Жаласніца знайшлася! – узрушыўся Папяровы Кароль. – Сама бяды нарабіла, а тады сама ўсіх шкадуе!

– Ваша Вялікасць, вы – наймудрэйшы правіцель, – азвалася Папяровая Каралева, і голас яе гучаў цвёрда. – Выявіце сваю мудрасць і зараз! Прынцэса кажа слушна. Што для нас важней – пакараць яе і пакінуць калекамі падданых, альбо памагчы тым, хто мае такую патрэбу?

– Да ўсяго, – дадала прынцэса, натхнёная падтрымкай Папяровай Каралевы, – я магу аднавіць уборы! Справіць новыя сукенкі дзяўчаткам, а хлопчыкам – новыя камізэлькі і нагавіцы!

О, гэта была шыкоўная прапанова! Папяровыя лялькі – вядомыя фарсухі! Уборы па некалькі разоў на дзень мяняюць.

Папяровы Кароль мусіў здацца на ўгаворы.

– Добра, – сказаў ён, – няхай сабе. А пасля ўсё адно трэба адцяць ёй нагу!

Але Папяровага Караля ўжо не чулі. Папяровыя лялькі пазлазілі са сваіх хадуляў, бо прынцэса даўно не плакала і ў Выцінанкавым лесе добра падсохла.

Прынцэса павярнула на пальцы срэбны напарстак – і перад ёй зноў ляжалі інструменты, неабходныя для працы.

Перш-наперш прынцэса аднавіла ўсім пацярпелым ногі. А пасля ўзялася выразаць камізэлькі, сукенкі, нагавіцы. Калі кроіла сукенку для Папяровай Каралевы, тая шапнула на вушка Румзанідзе:

– Прынцэса, Яго Вялікасці Папяроваму Каралю больш чым каму патрэбна дапамога! Праз тое, што яму намалявалі злосны твар, у яго нораў раздражнёнага тырана. Але ж ён мае добрае сэрца, мне гэта добра вядома! Ці не маглі б вы што-кольвек змяніць у абліччы Караля?

– А хто намаляваў Каралю такі злосны твар? – спытала прынцэса.

Папяровая Каралева здзіўлена глянула на яе.

– Прынцэса Румзаніда, згадайце! Выцінанкавы лес і папяровы народ выразалі ў вашым замку на ваш загад. А злосным твар Папяроваму Каралю дзеля смеху малявалі вы самі!

Вось дык так! З усяго вынікала, што ў Краіне Лялек не прападала нічога, калісьці ці зараз зробленага рукамі прынцэсы ці на яе загад.

І Румзаніда вельмі старанна выразала з паперы новую галаву ў кароне, намалявала на ёй прыветны твар і, скарыстаўшыся тым, што Папяровы Кароль задрамаў, бесперашкодна памяняла галовы месцамі.

– Ой, што гэта толькі казыталася? – заварушыўся абуджаны Папяровы Кароль і весела рассмяяўся. – Мая Каралева, мне здаецца ці сапраўды ў нашым Выцінанкавым лесе папрыгажэла? Нашы падданыя прыбраныя. А Вы, мая дарагая, у новым уборы – проста чароўная!

– Гэта ўсё прынцэса Румзаніда! – заўсміхалася Папяровая Каралева, а папяровыя лялькі падкінулі свае шапачкі і берэцікі высока ўгору.

Разам з усімі весела смяяўся і Папяровы Кароль. Зараз прыветны ўсмешлівы твар адпавядаў дабрыні яго сэрца і Кароль адчуваў незвычайную гармонію сам з сабой і з усім светам. Ён зусім забыўся на тое, што пагражаў прынцэсе адцяць нагу. Наадварот – загадаў вітаць Румзаніду як майстрыцу, якая здолела паправіць Выцінанкавы лес, ратавала пакалечаных папяровых чалавечкаў і падарыла яго падданым мноства прыгожых убораў.

Было загадана накрываць сталы, і папяровыя чалавечкі падаставалі са сховаў найсмачнейшы ласунак папяровай краіны – featureзнакаляровае канфеці. Іх насыпалі ў посуд з пап’е-машэ і хрумсталі, як кукурузныя палачкі.

Прынцэса Румзаніда не магла есці гэты дэлікатэс, таму папяровыя чалавечкі на знак вялікай прыхільнасці густа пасыпалі ім валасы прынцэсы.

Шапацелі на ветры выцінанкавыя дрэвы. Сонца, прабіваючыся праз карункавыя кроны, кідала на зямлю дзівоснай красы цені. Прыветна ківалі галоўкамі папяровыя званочкі, якія раслі ля лясных сцежак, і папяровы скрыпень махаў пышным чубам, вітаючы папяровы народ. Лёталі папяровыя мятлікі і ўсё імкнуліся сесці на галаву прынцэсе, бо праз рознакаляровае канфеці яе галава нагадвала кветнік.

Раптам Выцінанкавы лес закалыхаўся, і на ўзлеску загучала вясёлая музыка.

– О! – радасна ўскрыкнуў Папяровы Кароль. – Няўжо суседзі з Глінянага горада наведалі нас!

– Гэта значыла б, што Салонае мора адступіла! – узрадавалася і Папяровая Каралева.

Папяровыя чалавечкі памкнуліся было падхапіць каралеўскі трон разам са сваімі правіцелямі, каб несці іх насустрач пасольству. Але Кароль адмоўна закруціў галавой:

– Не зашкодзіць прайсціся пешкі! Як думаеце, Ваша Вялікасць? Хочацца згадаць, як шамаціць пад нагамі папяровая трава.

Каралева ахвотна пагадзілася, і папяровы народ, ачолены сваімі Каралём і Каралевай, рушылі на ўзлесак. Калі дрэвы расхінуліся, прынцэса пабачыла на даляглядзе дамы Глінянага горада – акурат такія ж, над якімі шчыравала яна ў замку пані Парцалянавай. І прынцэса з палёгкай уздыхнула: падобна, што падмытыя муры ёй таксама ўдалося паправіць.

– Паспяшайцеся, паспяшайцеся, прынцэса Румзаніда! – падаў голас Папяровы Кароль.

Ён загадаў папяровым чалавечкам насыпаць некалькі торбаў каляровага канфеці для жыхароў Глінянага горада. Раней, у злосці, Папяровы Кароль грэбаваў суседзямі, бо ўважаў іх за грубыя чарапкі. Але вось ён сам памяняўся – і з грубых чарапкоў і Гліняны горад, і яго насельнікі ў вачах Яго Вялікасці ўраз ператварыліся ў творы керамічнага мастацтва! Што ні кажы, жыццё такое, якім кожны здольны яго бачыць.

– Да Цёмнага лесу далёка, не варта губляць каштоўны час! – прыспешваў Румзаніду Папяровы Кароль.

Прынцэса дзівілася ўсё больш. Столькі бед нарабілася праз яе слёзы ў Краіне Лялек, але тут пра іх забываліся адразу ж, як толькі прынцэсе ўдавалася нешта выправіць.

Гліняныя музыкі зайгралі на акарыне і свісцёлках марш. Гліняны званочак зазваніў, прыспешваючы пусціцца ў дарогу. Папяровыя чалавечкі сыпанулі на ўсіх канфеці. Гліняныя конікі нецярпліва перабіралі нагамі, і гліняны возпік запрасіў прынцэсу Румзаніду сесці ў гліняны вазок: так яна зможа найхутчэй трапіць у Гліняны горад.

Наперадзе чакалі новыя прыгоды!

Малюнкі: Аксана АРАКЧЭЕВА





# «Глядзець пчалу»

*Традыцыі ляснога бортніцтва на беларускім Палессі налічваюць больш за тысячу гадоў. Гэта адзін з нямногіх спрадвечных промыслаў, які згадваецца нават у старажытных юрыдычных дакументах — такіх, як «Руская праўда» Яраслава Мудрага і Статут Вялікага Княства Літоўскага.*



У некаторых палескіх вёсках і сёння захаваліся каларытныя архаічныя формы гэтага занятку. У 2017 годзе лясное бортніцтва атрымала статус гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь. А ў гэтым годзе разглядаецца пытанне пра ўнясенне ў Спіс аб'ектаў Сусветнай нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА. У Еўропе ўжо даўно страчаны жывыя формы бортніцтва, з цягам часу пазабываліся сакрэты прываблівання лясных пчол у дуплы дрэў і майстэрства догляду за імі ў вуллях-калодах на вышыні. Наогул быў перыяд, калі людзі перасталі займацца аховай пчол, і толькі ў 2018 годзе ААН упершыню абвясціла Міжнародны дзень пчол — нарэшце зразумелі, што ўва многім дзякуючы гэтым унікальным казуркам на планеце захоўваецца экалагічны баланс.

## Сляды з бронзавага веку

З'явілася бортніцтва на славянскіх землях нароўні з іншымі старажытнымі промысламі — паляваннем, рыбнай лоўляй, збіральніцтвам — на стыку бронзавага і жалезнага вякоў. Гэта была адна з першых форм лесакарыстання чалавека, яна грунтавалася на развядзенні і доглядзе лясных пчол-баровак (ад слова бор) у натуральных дуплах, а пазней — у спецыяльна вырабленых чалавекам штучных прыстасаваннях — борцях.

Для старажытных княстваў гэта стала вельмі паспяховай сферай гаспадарчай дзейнасці і гандлю: мёд і воск у многіх славянскіх і балцкіх народаў служылі адзінкай тавараабмену, доўгі час яны былі ў ліку асноўных прадуктаў экспарту. Цікава, што ў першым вядомым нам зборніку прававых норм Кіеўскай Русі «Руская праўда», выдадзеным у 1016 г. князем Яраславам Мудрым, ёсць артыкулы, якія рэгулююць адносіны паміж уладальнікамі лясных борцей, правілы перадачы права на ўласнасць бортных дрэў ці калод зляснымі пчоламі, дарэння і спадчыннасці.

На пачатку XIII ст. бортніцтва на беларускіх землях з'яўлялася вельмі даходнай часткай эканомікі, таму ў Вялікім Княстве Літоўскім яму надавалася асаблівая ўвага. Промысел у гэты час дасягае найвышэйшай ступені свайго развіцця і дае значны эканамічны эфект. У Трэцім Статуце ВКЛ (1588 г.) бортніцтву нават прысвечаны асобныя артыкулы.

**Алена ЦЯРЭНЦЬЕВА**
**Фота: Альфрэд МІКУС**

А перыяд ад сярэдзіны XVI ст. атрымаў назву «Мядовае стагоддзе»: са змяненнем у ВКЛ сістэмы кіравання ляснымі ўгоддзямі не толькі багатай шляхце, але і «дробнаму люду» закон дазволіў браць промыслы — бабровы, рыбалоўны, лесанарыхтоўчы і інш. Гэта прыцягнула цэлыя вёскі да заняткаў борніцтвам, былі створаны свае цэхавыя суполкі, якія адстойвалі інтарэсы бортнікаў пры збыце мёду і воску, вырабаў пчалярства, адкрыліся першыя мядовыя крамы. Мёд з'явіўся на стале і ў простых людзей, стаў шырока выкарыстоўвацца ў народнай медыцыне, хатняй касметыцы і кулінарыі. Асаблівую папулярнасць набылі разнастайныя напоі з мёду з даданнем траў і спецый, а знакамітая «крамбамбуля» нават неаднойчы згадваецца ў летапісах пры апісанні важных сустрэч і вяльможных перамоў. Гэта была сапраўды адмысловая мядовая настойка, непаўторны смак якой надавалі ўсходнія вострыя прыправы ў спалучэнні з ляснымі беларускімі травамі.

Аднак у другой палове XIX ст. з развіццём прамысловай вытворчасці і індустрыялізацыяй эканомікі пачынаецца заняпад традыцыйных промыслаў. Бортніцтва паступова замяняецца таварным пчалярствам. Толькі ў аддаленых лясных раёнах Палесся застаюцца невялікія яго астраўкі. Тут бортніцтва паранейшаму ўспрымаецца як неад'емная частка прыроднага асяродку і жывой народнай культуры. Гэта паранейшаму спадчыннае рамяство, якое перадаецца з радавымі дрэвамі, дзедаўскай амуніцыяй і векавымі прыладамі працы. А галоўнае — перадаюцца светапогляд і традыцыі, у аснове якіх ляжыць натуральнае яднанне чалавека і прыроды.


**Бортніцтва на Убарці — гэта па-ранейшаму спадчыннае рамяство, якое перадаецца з радавымі дрэвамі, дзедаўскай амуніцыяй і векавымі прыладамі працы. А галоўнае — перадаюцца светапогляд і традыцыі, у аснове якіх ляжаць натуральнае яднанне чалавека і прыроды, жывая народная культура.**

## Як на Убарці збіраюць мёд

Дзікім пчолам для жыццядзейнасці патрэбныя лес і вада. У Лельчыцкім раёне лес пакрывае больш за 60 працэнтаў тэрыторыі. Рака Убарць і густыя лясы ўздоўж яе берагоў здаўна ўпадабаныя чалавекам як найлепшыя мясціны для развіцця бортніцтва. Бо і забалочаныя азёры з няспешнымі ручаямі, і пойменныя лугі з мноствам разнастайных раслін — усё гэта спрыяльнае асяроддзе для расплоджвання лясных пчол.

Тут беражліва захоўваюць старадаўнія інструменты і рознае начынне ямчэ ад прадзедаў, па іх узорах выбляюць прыстасаванні для лажання па дрэвах і нагляду за пчоламі на вышыні. Борцевыя домікі з суцэльнага бервяна дуба або сасны і сёння вырабляюць, выкарыстоўваючы старыя прыёмы дзяўблення і габлёўкі дрэва. Многія палешукі з убарцьскага Палесся называюць сябе пчалярамі, паколькі іншых заняткаў, акрамя лясного пчалярства, не маюць. У іншых з іх налічваецца па 50 і больш вулляў у лесе. Як і шмат гадоў таму, лясныя борці перадаюцца ў спадчыну, іх дораць на вяселле ці пры нараджэнні дзіцяці як самы дарагі падарунак. Існуе таксама законнае права не толькі на борць, але і на новае дрэва, якое ты знайшоў у лесе і на якім замацаваў сваю калоду (так званае «звычаёвае права»). Гэтых правілаў і сёння строга прытрымліваюцца.

*Як мінімум 500 гадоў не перапыняюцца заняткі бортніцтвам у вёсках на берагах Убарці!*

Лясное бортніцтва цяпер не прыносіць асаблівага прыбытку, але не дзеля грошай і не дзеля мёду займаюцца палешукі гэтай справай: для іх важная памяць продкаў, якія завяшчалі «глядзець лес і глядзець пчалу». Да таго ж, дзедаўскае рамяство настолькі цікавае, што захапляе без астатку. Турботы пра





борці і пчол — занятак пры ўдзеле ўсёй сям'і, сакрэты пчалярства тут спасцігаюць з дзяцінства. «Каб пчол вадзіць, трэба сэрцам іх любіць», — кажуць на Убарці.

Дарэчы, палескія бортнікі ніколі не скажуць, што ідуць за мёдам. Яны заўсёды ідуць «глядзець пчалу», таму што галоўнае ў гэтым старажытным промысле — пчала і яе здароўе. Гэта не проста казурка, а «Божае стварэнне, роўнае чалавеку», з якім чалавек выбудоўвае парытэтныя адносіны. Пчалу не крыўдзяць, пра яе гавораць з пяшчотай і клопатам: «Не я збіраю мёд, а пчала мне яго дае». Менавіта таму «глядзець пчалу» значна больш важна, чым пампаваць мёд з пасекі. Прафесійны пчаляр гаворыць, што ён забяспечвае ўтрыманне пчаліных сем'яў у вуллях, дбаючы аб будучым салодкім ураджаі, а бортнік — што служыць пчале, дапамагае ёй перажыць халады, чысціць яе дом і абараняе борці ад нападаў дзікіх жывёл. А адначасова сочыць і за станам участка прыборцевага лесу: ці не занадта караед размножыўся, ці не распаўсюдзілася звыш меры каранёвая гніль? Лясны мёд — гэта абавязкова вынік сумленнай працы.

Клопатаў у бортнікаў хапае круглы год. Узімку прыводзіцца ў парадак неабходная амуніцыя: жэнь — тоўстая вяроўка са скуры быка, дымар — прылада для абкурвання пчол, а яшчэ плеценыя кашы для збору мёду, стромкія лёгкія лесвіцы... Таксама важна падрыхтаваць новыя калоды, знайсці дрэвы, куды іх потым па вясне прымацаваць, каб паспець да пачатку раення.

Як толькі прыгравае сонца і пачынаюць квітнець першыя дрэвы і хмызнякі, пчолы вылятаюць з лясных домікаў на сваю працу. Да гэтага моманту бортнікі спяшаюцца агледзець і адрамантаваць усе борці. Заўважыў у калодзе дзірку — трэба тэрмінова залатаць! Ворагаў у лясных пчол дастаткова, тая ж куніца — вялікая аматарка мёду, або жаўна — заўзяты пажыральнік насякомых. Раней і мядзведзь паласавацца салодзенькім мог наведацца.

Улетку бортнікі кантралююць дзялянкі і правяраюць, ці камфортна пчолам, ці не завяліся шкоднікі — мурашкі, воскавая моль. Дзеля гэтага ў борць закладваюць багун, мох або пахкія травы — мяту, лімоннік, каб адпужваць паразітаў.

Залатая пара — восень, збор бурштынавага ляснога мёду! Бортнік бярэ не ўсё, большую частку пакідае пчолам, бо наперадзе ў іх халодная зімоўка. Кажуць, што ва ўраджайныя гады з адной калоды можна здабыць каля 20 кг. Колькі ў яго пчол, бортнік ніколі напэўна не ведае: можа, 100 тысяч, а можа і ўсе 200 — хто ж іх, дзікіх, палічыць? Гаспадары, у каго шмат борцей, называюць сябе не багатымі, а шчаслівымі. Каб адчуць сваіх пчол, бортнік доўга назірае, як яны лётаюць, як працуюць, слухае, лежачы пад дрэвам, як яны гудуць. Магчыма, камусьці падасца дзіўным такі занятак для дарослага мужчыны. Як і тое, што прымудроны жыццём чалавек можа плакаць ад адчаю наўзрыд, як дзіця, калі прыходзіць пасля зімы і бачыць, што пчолы мёртвыя ...

Сёння каля 200 чалавек паабапал ракі Убарць займаюцца лясным бортніцтвам згодна з традыцыямі, якія перайшлі да іх ад дзядоў і прадзедаў. Нацыянальны парк «Прыпяцкі» і мясцовыя лясніцтвы ў гэтым ім садзейнічаюць.



## Зберагчы традыцыі

У Канвенцыі аб біялагічнай разнастайнасці (1992 г.) ёсць артыкул пра важнасць усямернай падтрымкі традыцыйных ведаў і практык, якія дапамагаюць захоўваць экалогію і гармонію паміж чалавекам і прыродай. Бортніцтва — адна з такіх жывых традыцый, неад´емная частка не толькі прыроднага асяродку беларускага Палесся, але і культурнага кода мясцовага насельніцтва.

Унікальнасць бортніцтва сёння ў тым, што чалавек не ўмешваецца ў жыццё лясных пчол. І лясны мёд, такім чынам, атрымліваецца, адзіны 100% натуральны прадукт пчалярства, таму што на вышыні дрэва ў борцях пчолы самі ствараюць уласны мікракосм, дзе яны самастойна рэгулююць тэмпературу і ўтрыманне вуглякіслага газу. У працэсе атрымання ляснога мёду не выкарыстоўваюцца дабаўкі прамысловага парафіна для сотаў, цукар і лекі для пчол, яды для кляшчоў і інш.

Як зменіцца жыццё палескіх бортнікаў, калі лясное бортніцтва атрымае статус Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА? На гэта член Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па пытаннях ЮНЕСКА, дырэктар фонду «Культурная спадчына і сучаснасць» Ала Сташкевіч падчас аднаго з інтэрв'ю адказала гранічна шчыра: «Зазвычай, такі статус з´яўляецца рэсурсам для развіцця рэгіёнаў — праз турызм або творчы бізнес. Але ў выпадку з бортніцтвам трэба разумець, што гэта не забаўка для публікі, а рэальнае жыццё палескіх вёсак. Носьбітамі самабытнай традыцыі з'яўляюцца не артысты ці турыстычныя гіды, а людзі, якія робяць тое, што рабілі іх продкі, і гэтыя людзі павінны мець магчымасць працягваць свой звычайны лад жыцця. Напэўна, медыяпрадукт "бортніцкі лясны мёд" хутка з´явіцца на рынку, хоць на самой справе яго будуць здабываць на велізарных пчальніках, а не палескія бортнікі. Адсюль выснова: неабходна стварыць сертыфікацыю сапраўднай нацыянальнай прадукцыі, абараніць інтэлектуальную ўласнасць майстроў усіх традыцыйных народных промыслаў. Нематэрыяльная культурная спадчына — гэта не толькі фальклор, як многія думаюць. Сюды адносяцца сапраўды ўнікальныя, захаваныя з далёкага мінулага веды і навыкі, як бортніцтва. Сёння шмат розных рызык для іх знікнення: стандартызацыя жыцця, панаванне маскультуры, дэмаграфічныя і эканамічныя праблемы. Таму важна забяспечыць іх эканамічную і сацыяльную абароненасць, у тым ліку заканадаўча або адміністрацыйнымі мэтадамі».

Навукоўцы кажуць: калі на Палессі знікне самабытнае лясное бортніцтва, то ўслед за ім верагоднае знікненне больш за 20 відаў раслін, якія апыляюцца servicesляснымі пчоламі. Страціць прырода, але яшчэ больш страціць чалавек ...



# Ирина Перегуд: «В каждой кукле сокрыта магия»

*Авторские куклы особенные. Мастер столько часов проводит вместе с ними, творя волшебство перевоплощения из безликой бумаги в характерную красавицу. Наверное, поэтому они как живые, у каждой свой индивидуальный образ и своя душа. Они отвечают всегда любовью на любовь, искренне дарят хорошее настроение, радость и душевное равновесие своим обладательницам.*

Во многих культурах кукла наделяется магическими свойствами. Глядя на кукол минской мастерицы Ирины ПЕРЕГУД, легко ощутить эту магию.

**— Как вы пришли в ремесленничество и почему именно куклы?**

— Выросла я в обычной, совсем не творческой семье. Мама, конечно, умела зашить-пришить, но не более. Бабушка немного рукодельничала, она и научила меня вязать простейшие вещи. Когда родились дети, я стала вязать больше. Потом увлеклась поделками и плетением из бумажных трубочек, освоила вышивание крестиком.

Но самой большой моей страстью стало выращивание роз. Именно они и привели меня к куклам: искала информацию о розах в интернете и натолкнулась на профиль мастерицы, которая шила текстильных кукол. Условно их называют «чердачными», потому что материалы каждый сможет найти у себя дома, на своём «чердаке». Для их создания не требуются дорогие ткани и большие знания в области кройки и шитья. Сейчас я понимаю, что эти игрушки хоть и милые, но довольно простые. А тогда для меня это было какое-то чудо. Цена в 25 долларов меня удивила, и по описанию в сети из старой льняной простыни я сделала свою первую куклу.

Виталина БАНДАРОВИЧ
Фото из альбома Ирины ПЕРЕГУД

**— Сегодня текстильные куклы — это популярные интерьерные украшения.**

— Да, сейчас они необычайно модные и востребованные — и для городской квартиры, и для загородного дома. В «чердачном» стиле шьются не только куколки, но ещё и разные зверушки: коты, собачки, улитки, мишки, слоники и др. Вообще «чердачным» куклам около 100 лет!

Спустя время после первых работ мне захотелось расширить свои горизонты, и я начала искать всё о подвижных и каркасных игрушках. Как только научилась делать их, перешла на шитьё медведей Тедди: они могут двигать лапками, вращать головой, сидеть и стоять. Я безумно увлеклась ими, с трепетом продумывала каждый образ, каждую пуговку на костюме.

Но потом однажды увидела лепную куклу — и влюбилась! С тех пор меня не покидала мысль, что я хочу сделать такую сама. Это была мечта, и я даже не представляла, что дорасту до неё. Теперь всё своё основное время уделяю именно лепным куклам.

**— В качестве материала вы используете папье-маше. Казалось бы, бумага и клей недолговечны. Может ли быть так, что работа, например, размокнет?**

— Эти куклы живут дольше, чем люди. Конечно, если она попадёт в потоп или долго пролежит в ванной, может нарушиться защитный слой, испортятся волосы и одежда. Но если, например, вы просто вместе с куклой попали под дождь, то ничего не случится.

**— Сколько времени у вас уходит на работу?**

— Примерно месяц на куклу, две недели на медведя. Когда заканчиваю работу, ещё несколько дней строго «придираюсь» к ней, что-нибудь поправляю (*улыбается*). Фотографирую и смотрю, нет ли асимметрии, аккуратна ли одежда, правильно ли переданы эмоции.

**— Все герои, созданные вами, будто пришли из сказки. Как рождаются такие волшебные образы?**

— Образы появляются в конце, а начинается всё с... ботинок. При создании и сборке этих кукол нужно сначала сформировать каркас и проработать стопу, чтобы она была устойчивой. Значит, нужна обувь. Идеи для куклы у меня всегда есть, но зачастую до последнего момента я не знаю, какой получится новая фигура. В этом всегда есть особая магия.

Знаете, я часто говорю: «Когда покупаешь что-то у художника/мастера, ты покупаешь не просто вещь. Ты покупаешь сотни часов ошибок и экспериментов! Ты покупаешь дни, недели, месяцы разочарований, поисков и моменты чистой радости. Ты покупаешь частичку сердца, души и мгновения чьей-то жизни».







**— Я заметила, что вы даёте куклам имена...**

— Однажды я долго не могла закончить куклу, пока не дала ей имя. Работа никак не шла. Мне казалось, что всё нужно опять переделывать. Тогда я назвала куклу — Мия. У каждого имени есть своё значение. Мия — «непокорная, своенравная». Всё стало на свои места, и эта упрямица поддалась мне.

А кукла Мальвина появилась потому, что мне очень хотелось сделать именно этого персонажа. Правда, в итоге получилась не совсем Мальвина, волосы у неё оказались не того оттенка... Для волос я использую козью шерсть, а в её составе, как выяснилось, слишком много жёлтого пигмента. На таких нюансах я постоянно учусь.

**— Что в работе с куклами было самым сложным для вас?**

— Очень долго училась рисовать лица. Потребовалось много тренировок на простых куклах, чтобы прийти к результату, который меня устроил бы. Этого оказалось мало. Хотя первая лепная кукла была в моих глазах самой замечательной и прекрасной, я понимала, что есть к чему стремиться. Я не заканчивала никаких курсов, поэтому мне сложнее, чем профессиональным художнице или портнихе. Знания, которыми владеют они, ко мне приходит с набиванием шишек. Я всё ещё считаю себя любителем. Новичкам бы посоветовала изучать анатомию и читать книги для художников. Буду банальна, но в любом деле важна «насмотренность». Теперь я не просто иду по улице — я вглядываюсь в лица: глаза, нос, брови, выражение эмоций.

> *“Идеи для куклы у меня всегда есть, но зачастую до последнего момента не знаю, какой получится новая фигура. В этом - особая магия.”*



## О вдохновении

Порой его можно встретить в лавках старьёвщиков, в коробке с бусинами, в сложенных стопкой тканях или же в распустившихся в саду кремовых ирисах. А порой я нахожу его в особенных книгах с волшебными иллюстрациями. Они способны так завладеть воображением, что иногда не замечаешь, когда заканчивается волшебство истории и начинается волшебство создания образа героя.







**— Какие интересные работы вы делали на заказ?**

— Из последнего – Анна, героиня мульфильма «Холодное сердце». Это был особенный заказ. Прежде я никогда не работала с мультипликационными персонажами, у них своя мимика и пластика. Очень важно суметь это передать. Кто бы знал, сколько раз я пересмотрела мультики, сколько придумала вариаций позы для героини, костюмов! Выбрала самое её известное зелёное платье, постаралась сделать идеальным. В итоге заказчица осталась довольна.

Ещё запомнилась работа, которую выполняла для онлайн-конкурса «Маскарад». Мой персонаж – героиня японской мифологии лиса Кицунэ, наделённая сверхъестественными способностями. Я вложила в неё столько сил, времени, энергии, эмоций... Изучала костюм, обычаи и легенды Японии. Получилась очень интересная кукла, но, к сожалению, в конкурсе не выиграла.

**— Авторские игрушки — не совсем обычный товар. Кто ваши покупатели?**

— Люди, которые тонко чувствуют искусство. Это не обязательно коллекционеры. Знаете, я тоже покупаю игрушки у других мастеров.

**— Как семья относится к вашему увлечению?**

— В семье привыкли, что я всегда чем-то занимаюсь. Когда я с головой ушла в создание кукол и начала посвящать этому слишком много времени, дома заволновались. Муж беспокоился, что я поздно засыпаю и реже езжу на дачу. Сыновья спрашивали, приносит ли мне доход то, что отнимает столько сил и времени. Но постепенно всё улеглось. Теперь муж частенько заходит в мою мастерскую и интересуется, что за работа и как продвигается. Он уже привык, что отвёртки, плоскогубцы и шуруповёрт нужно искать у меня. Сыновья помогают делать фото и видео моих кукол. Мои мужчины стараются помочь, радуются моим успехам и во всём поддерживают меня.













## *О творчестве*

Созидать и творить — это моё страстное желание и лучшее времяпровождение. Когда я нахожусь в процессе создания игрушки, бытовые проблемы уходят на второй план. Мне хочется скорее увидеть, какой будет новая кукла.

Мастерим

# *Шляпку канотье из джута*

Для работы понадобится: *голова куклы или мишки ❖ сантиметровая лента ❖ бумага ❖ картон ❖ карандаш ❖ бумажный скотч ❖ пищевая плёнка ❖ клей ПВА ❖ джутовый шнур ❖ кисточка. Свободное время* ☺

Инструкция:

1 Снимаем мерку окружности головы.

2 Обводим на бумаге снятую мерку прямо по контурам сантиметровой ленты. Это важно, потому что канотье имеет форму не круга, а овала.

3 Добавляем желаемые по размеру поля шляпки. Важно: тулья имеет ширину, равную ширине полей.

4 Всё вырезаем. Переносим на картон. Должно получиться 3 детали: поля, тулья и донышко.

5 Склеиваем их между собой малярным скотчем.

6 Накрываем пищевой плёнкой по форме шляпки. Кладём на стол.

7 Берём клей ПВА, смазываем кистью джутовый шнур.

8 Сначала закручиваем маленькое колечко. Затем кладём на заготовку и продолжаем смазывать шнур клеем, плотно прижимая витки джута, укладываем на шляпку, пока не покроется вся заготовка.



После высыхания снимаем шляпку с формы и украшаем. Вуаля! Вы справились!





Цветы, созвездия, волшебные птицы — что вышить на футболке, каждый решает сам. Но многие боятся декорировать одежду вышивкой, потому что трикотажная ткань не имеет чётко выраженных квадратиков. Как же вышивать на трикотаже? Проблема решается с помощью накладной канвы.

Накладная канва – это довольно жёсткая накрахмаленная ткань с толстыми нитями. Её накладывают на футболку, майку, блузку там, где необходимо сделать вышивку, и выполняют узор поверх решётчатого переплетения нитей. Канву затем удаляют.

Подсказки. 1. Вырезать канву необходимо строго по размеру рисунка вышивки. 2. Сперва обязательно канву нужно прогладить, чтобы избежать перекоса. 3. Примётывать канву к ткани нужно достаточно плотно и аккуратно, чтобы избежать скольжения и появления «морщин». 4. Если одежда новая и ни разу не была в стирке, желательно её постирать: это предохранит от последующей усадки и искажения вышивки.







| DMC |
|---|
| 956 |
| 963 |
| 3609 |
| 209 |
| 340 |
| 3746 |
| 797 |
| 986 |
| 907 |
| 906 |
| B5200 |
| 3861 |
| 699 |

Размер вышитой картины при стандартной канве 14 кл. на дюйм – 18×23,5 см.



*Дайце, дайце рукавіцы,*
*рукі пэцкаюць чарніцы!*

**Раіса Баравікова**

# Сінія бусы нашага лесу

Сярэдзіна лета — самая ўраджайная пара для збору ягад. Тут кожны дзень на рахунку, каб паспець назапасіць лясных вітамінаў. Быццам разумеючы сваю значнасць і важнасць, даўжэй за ўсіх радуюць нас сваёй прысутнасцю ў лесе ягады чарніцы: іх збор пачынаюць у сярэдзіне ліпеня і працягваюць да самай восені. Галоўнае — каб пашчасціла знайсці адмысловую чарнічную палянку.

